Источник: "Звязда" - 2014-04-17

Даты Падзеі Людзі

**1894** год — 120 гадоў таму нарадзіўся Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў, савецкі дзяржаўны і партыйны дзеяч, першы сакратар Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Старшыня Савета Міністраў СССР, генерал-лейтэнант. Адзін з ініцыятараў «адлігі» ва ўнутранай і знешняй палітыцы, рэабілітацыі ахвяр рэпрэсій. Хрушчоў распачаў спробу мадэрнізаваць партыйна-дзяржаўную сістэму (падзяліў партыйныя арганізацыі на прамысловыя і сельскія), палепшыць умовы жыцця насельніцтва. На XX (1956) і XXII (1961) з'ездах КПСС ён выступіў з рэзкай крытыкай так званага «культу асобы» і дзейнасці І.В. Сталіна. Аднак пабудова ў краіне наменклатурнага рэжыму, падаўленне іншадумства, сілавы разгон дэманстрацый (Тбілісі, 1956; Новачаркаск, 1962), абвастрэнне ваеннага супрацьстаяння з Захадам (берлінскі 1961-га і карыбскі 1962-га года крызісы) і з Кітаем, а таксама палітычнае пражэкцёрства (заклікі «дагнаць і перагнаць Амерыку», абяцанні пабудаваць камунізм да 1980 года) рабілі яго палітыку непаслядоўнай. Незадаволенасць дзяржаўнага і партыйнага апарату прывяла да таго, што пленумам ЦК КПСС 14 кастрычніка1964-га Мікіта Хрушчоў быў вызвалены ад сваіх абавязкаў і адпраўлены на пенсію.

**1899** год — 115 гадоў таму нарадзілася (горад Мінск) Лідзія Іванаўна Ржэцкая, выдатная беларуская актрыса, народная артыстка Беларусі (1944) і СССР (1955). З 1917 года працавала ў Першым таварыстве беларускай драмы і камедыі, з 1921-га — у Беларускім тэатры імя Я. Купалы. Стварыла на сцэне рознахарактарныя вобразы драматычнага і камедыйнага плана. Сярод лепшых роляў у беларускім рэпертуары: Альжбета («Паўлінка» Я. Купалы), Маці («Айчына» К. Чорнага), Вярбіцкая



(«Пяюць жаўрукі» Я. Купалы) і іншыя. Высокім майстэрствам адзначаны класічныя ролі рускай і замежнай драматургіі. Выступала на радыё, здымалася ў кінафільмах «Хто смяецца апошнім» і «Гадзіннік спыніўся апоўначы». Лаўрэатка Дзяржаўнай прэміі СССР (1951). Памерла ў 1977 годзе.

**1932** год — прынята рашэнне СНК БССР аб стварэнні ў сістэме Акадэміі навук батанічнага саду. Пад яго была адведзена пляцоўка ў 106 га, якая раней належала Усебеларускай сельскагаспадарчай і прамысловай выставе. Да пачатку вайны расліннымі калекцыямі ўжо было занята 55% плошчы. З 1967 года мае правы навукова-даследчага інстытута.

## Было сказана

**Уладзімір КАРАТКЕВІЧ, пісьменнік:**

*«Стома — смерць. Ідзі вышэй сіл сваіх, і станеш жыць доўга».*